# ВесціБДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

## № 1(71) 2012

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**

***Галоўны рэдактар***

**П.Д. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

В.В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Л.М. Давыдзенка
А.В. Данільчанка
А.П. Жытко
М.М. Забаўскі
І.В. Катляроў
П.В. Кікель
Г.А. Космач
А.М. Люты
У.А. Мельнік
А.І. Смолік
А.С. Цернавы
В.С. Цітоў
В.В. Шынкароў

## Змест

***Паліталогія***

*Зенчанка В.А., Дэйч В.С.* Мясцовае самакіраванне ў Рэспубліцы Беларусь і шляхі яго ўдасканалення ........ 3

*Сіманоўскі С.І.* Палітыка калектыўнай бяспекі ........ 7

*Туркеніч С.У.* Тэарэтычныя аспекты ўплыву ідэалогіі на працэсы грамадскага і дзяржаўнага развіцця Рэспублікі Беларусь ........ 10

*Зенчанка С.В.* Знешняя міграцыйная палітыка Рэспублікі Беларусь: кірункі ўдасканалення ........ 13

*Канапацкі М.Б.* Тэакратычныя тэндэнцыі палітычнага развіцця Турцыі ........ 17

*Самер З. Абдул Разак.* Роля шыіцкіх арабскіх партый у палітычным працэсе сучаснага Ірака ........ 20

***Сацыялогія***

*Андрас І.А.* Інтэграцыя бізнес-асяроддзя Беларусі і Расіі: эканоміка-сацыялагічны аспект ........ 24

*Хамутоўская С.В.* Насельніцтва Рэспублікі Беларусь аб сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне (2000–2010 гг.) ........ 28

*Падгайская Л.І.* Сучасныя сацыяльныя працэсы ў дыскурсе тэорыі справядлівасці ........ 32

*Сячко Н.Н.* Узровень і якасць жыцця беларускага насельніцтва як прыярытэтныя кірункі сацыяльнай палітыкі ........ 36

*Новікава С.І.* Вышэйшая адукацыя асоб з абмежаванымі магчымасцямі ........ 40

*Бядуліна Г.Ф.* Сацыяльныя аспекты прафілактыкі суіцыдальных паводзін падлеткаў ........ 45

*Цітова Ю.М.* Камерцыйная рэклама на беларускім тэлебачанні як сродак уздзеяння на эканамічныя паводзіны спажыўцоў ........ 50

*Шухатовіч В.Р.* Вывучэнне арыентацый насельніцтва Рэспублікі Беларусь на здаровы лад жыцця ........ 54

*Раманава С.П.* Дзяржава ўсеагульнага дабрабыту: асноўныя падыходы да канцэптуальнага асэнсавання ў сучаснай заходняй навуцы і практыцы ........ 58

***Эканоміка***

*Давыдзенка А.Л., Давыдзенка Л.М.* Інтэлектуалізацыя рынку інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь ........ 64

*Губарэвіч В.Ф.* Гандлёвая марка як аб'ект інтэлектуальнай уласнасці ........ 68

УДК 327.3

*С.І. Сіманоўскі,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры паліталогіі БДУ*

# ПАЛІТЫКА КАЛЕКТЫЎНАЙ БЯСПЕКІ

Дзяржавы ўсяго свету надаюць асаблівую ўвагу сваёй бяспецы, што цалкам зразумела і абгрунтавана. Яны ўмацоўваюць свае ваенныя пазіцыі, утрымліваюць арміі, праводзяць вайсковыя вучэнні. Даўно вядома, што з ворагам справіцца лягчэй пры падтрымцы саюзнікаў. Таму 7 краін-удзельніц СНД – Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан, Узбекістан – аб'ядналіся для прадухілення і ліквідацыі пагрозы міру і сумеснай абароны ад агрэсіі, забеспячэння суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці, заснавалі Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы. АДКБ – гэта ваенна-палітычны саюз, утвораны дзяржавамі СНД на аснове Дагавора аб калектыўнай бяспецы (ДКБ), падпісанага 15 мая 1992 г. У 1993 г. да дамовы ўякасці назіральнікаў далучыліся Азербайджан, Малдова і Украіна.

Пасля шэраг краін спынілі свой удзел у Дагаворы аб калектыўнай бяспецы (ДКБ). У 1999 г. з ДКБ выйшлі Азербайджан, Грузія, Узбекістан. Украіна і Малдова таксама страцілі цікавасць да ваеннай інтэграцыі ў рамках СНД. Астатнія краіны (Арменія, Беларусь, Казахстан, Кіргізія, Расія і Таджыкістан) 7 кастрычніка 2002 г. на саміце краін СНД у Кішынёве заснавалі новую структуру – Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). 26 снежня 2003 г. АДКБ была зарэгістравана ў ААН на правах рэгіянальнай міжнароднай арганізацыі.

Мэтамі Арганізацыі з'яўляюцца ўмацаванне міру, міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і стабільнасці, абарона на калектыўнай аснове незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту дзяржаў-членаў, прыярытэт у дасягненні якіх аддаецца палітычным сродкам. У снежні 2005 г. у Маскве адбыліся перамовы міністраў замежных спраў, міністраў абароны і сакратароў саветаў бяспекі, у выніку якіх былі дасягнуты дамоўленасці аб стварэнні міратворчага кантынгенту, што будзе ажыццяўляць дапа-

могу ва ўрэгуляванні канфліктаў на тэрыторыі краін-удзельніц дагавора. Гэтыя войскі будуць знаходзіцца пад нацыянальнай юрысдыкцыяй, а ў выпадку правядзення міратворчай аперацыі выводзіцца пад адзінае камандаванне па рашэнні Савета калектыўнай бяспекі (СКБ) і па мандаце Савета Бяспекі ААН.

23 чэрвеня 2006 г. Узбекістан зняў маратон рый на актыўны ўдзел у рамках АДКБ і стаў паўнапраўным членам гэтай арганізацыі [1, с. 31]. 6 кастрычніка 2007 г. у Душанбэ прайшоў саміт АДКБ, асноўным вынікам працы якога стала дамоўленасць аб магчымасці для краін-членаў АДКБ набываць у Расіі ўзбраенне і спецтэхніку для аснашчэння сіл і спецслужбаў па ўнутраных расійскіх цэнах. Акрамя таго, там жа быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж АДКБ і Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва [2].

28 сакавіка 2008 г. парламент Узбекістана ратыфікаваў дакумент, што аднавіў удзел краіны ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

На думку шэрага экспертаў, стварэнне АДКБ адлюстравала імкненне Расіі перашкодзіць далейшаму пашырэнню блока НАТА на Усход і ўтрымаць частку краін СНД у арбіце расійскага ваеннага ўплыву. Вышэйшым органам Арганізацыі з'яўляецца Савет калектыўнай бяспекі, у склад якога ўваходзяць кіраўнікі дзяржаў-членаў. Савет разглядае прынцыповыя пытанні дзейнасці Арганізацыі і прымае рашэнні, накіраваныя на рэалізацыю яе мэт і задач, а таксама забяспечвае каардынацыю і сумесную дзейнасць дзяржаў-членаў для выканання гэтых мэт.

Уступіла ў сілу Пагадненне аб міратворчай дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). Дакумент прадугледжвае стварэнне Міратворчых сіл Арганізацыі на аснове міратворчых кантынгентаў дзяржаў-членаў.

Пагадненне аб міратворчай дзейнасці АДКБ было падпісана кіраўнікамі дзяржаў-членаў Арганізацыі 6 кастрычніка 2007 г. на саміце ў Душанбэ. Беларусь 14 ліпеня, Казахстан 18 лістапада і Арменія 29 снежня 2008 г. ратыфікавалі дакумент. Чацвёртай дзяржавай, якая выканала ўнутрыдзяржаўныя працэдуры, неабходныя для ўступлення Пагаднення ў сілу, стала Расійская Федэрацыя.

Пагадненнем прадугледжваецца стварэнне на пастаяннай аснове Міратворчых сіл АДКБ з выдзяленнем дзяржавамі-членамі на пастаяннай аснове міратворчых кантынгентаў. Апошнія будуць праходзіць падрыхтоўку па адзіных праграмах, аснашчацца адзінымі або сумяшчальнымі ўзорамі ўзбраенняў і сувязі, прымаць удзел у рэгулярных сумесных вучэннях. Згодна з дакументам, Міратворчыя сілы АДКБ змогуць прымаць удзел у міратворчых аперацыях як на тэрыторыі дзяржаў-членаў Арганізацыі, так і (па рашэнні Савета Бяспекі ААН) у іншых рэгіёнах [2]. У цяперашні час АДКБ вядзе актыўную палітыку па многіх напрамках. На саміце АДКБ, што прайшоў 4 лютага 2009 г., было заяўлена пра тое, што будуць сфарміраваны Калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання (КСАР), галоўнымі задачамі якіх будзе адбіццё ваенных агрэсій і правядзенне спецаперацый па барацьбе з міжнародным тэрарызмам і транснацыянальнай злачыннасцю. КСАР таксама прымуць удзел у ліквідацыі наркатычнай пагрозы, што зыходзіць ад Афганістана, барацьбе з ісламістамі ў Цэнтральнай Азіі і ў ліквідацыі наступстваў прыродных і тэхнагенных катастроф [3, с. 104].

14 чэрвеня 2009 г. у Маскве адбылася сесія Савета калектыўнай бяспекі дзяржаў, па рашэнні якой павінны былі быць створаны Калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання. Дакумент адобрылі Расія, Арменія, Кіргізія, Казахстан і Таджыкістан. Беларусь падпісала яго 20 кастрычніка 2009 г.

У адпаведнасці з дасягнутымі пагадненнямі, КСАР павінны адпавядаць чатыром асноўным патрабаванням:

- высокая мабільнасць, якая прадугледжвае хуткую дастаўку ў патрэбнае месца;
- універсальнасць, гэта значыць здольнасць супрацьстаяць не толькі ваенным пагрозам, але і, напрыклад, нападу бандфарміраванняў;
- наяўнасць пастаянна дзеючага органа кіравання;
- наяўнасць заканадаўчай базы, якая дае магчымасць неадкладнага прымянення КСАР па рашэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ [4]. Важнымі асаблівасцямі гэтага дакумента з'яўляюцца тыя, што, па-першае, кожная дзяржава сама вырашае пытанне аб уласнай бяспецы, а ўмяшальніцтва КСАР маецца на ўвазе тады, калі будзе не ў стане абыйсціся без дапамогі саюзнікаў. Па-другое, КСАР будуць прымяняцца толькі па рашэнні Савета калектыўнай бяспекі АДКБ, гэта значыць кіраўнікоў дзяржаў. У кастрычніку 2009 г. на тэрыторыі Казахстана прайшлі першыя вучэнні Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання дзяржаў АДКБ, у якіх прынялі ўдзел больш за 7 тыс. вайскоўцаў.

Адносна перспектыў пашырэння аб'яднанай сістэмы СПА, якая была створана Расіяй і Беларуссю, Н. Бардзюжа (Сакратар АДКБ) паведаміў аб магчымым з'яўленні ў хуткім часе такіх рэгіянальных сістэм у Арменіі і Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне, а ў будучым – каардынацыі іх дзейнасцю ў рамках супрацоўніцтва кра-

ін-удзельніц АДКБ. Акрамя таго, могуць быць створаны сумесныя прадпрыемствы па распрацоўцы і вытворчасці ваеннай тэхнікі [5, с. 22]. АДКБ таксама зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Афганістанам і гатова разглядаць любыя формы сумеснага ўзаемадзеяння з уладамі гэтай краіны па праблемах, звязаных з бяспекай, і сумеснай барацьбы з наркатрафікам, што ідзе з яе тэрыторыі [6].

З 31 сакавіка 2009 г. уступіла ў сілу Пагадненне аб узаемнай ахове правоў на выніки інтэлектуальнай дзейнасці, якія атрыманы і выкарыстоўваюцца ў ходзе ваенна-эканамічнага супрацоўніцтва ў рамках АДКБ. У адпаведнасці з Пагадненнем, супрацоўніцтва ў названай сферы будзе ажыццяўляцца шляхам узгаднення пытанняў, звязаных з аховай правоў на атрыманыя вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, правядзення мерапрыемстваў па папярэджанні правапарушэнняў у галіне інтэлектуальнай уласнасці, абмену вопытам па пытаннях аховы правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці і інш. Пры гэтым удзельнікі ваенна-эканамічнага супрацоўніцтва ў фармаце АДКБ ва ўсіх дагаворах (кантрактах) павінны прадугледжваць, што ўжыванне і выкарыстанне атрыманых вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці будзе ажыццяўляцца толькі пасля забеспячэння іх прававой аховы.

Пагадненне накладвае на яго ўдзельнікаў абавязацельствы не вырабляць і не экспартаваць з тэрыторыі сваёй дзяржавы ў трэція краіны прадукцыю ваеннага прызначэння (ПВН), вырабленую з выкарыстаннем вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці, правы на якія належаць іншаму боку або ўдзельнікам ваенна-эканамічнага супрацоўніцтва ад гэтага боку, без пісьмовай згоды пазначанага боку [3, с.151].

Плануецца актывізаваць узаемадзеянне спецслужбаў дзяржаў-членаў АДКБ, якія вырашаюць задачы барацьбы са злачыннасцю ў сферы інфармацыйных тэхналогій па забеспячэнні абараназдольнасці дзяржаў-членаў АДКБ у цэлым і крытычна важных аб'ектаў інфраструктуры ў прыватнасці. Акрамя таго, вялікая ўвага будзе нададзена процідзеянню выкарыстання інфармацыйных тэхналогій для падрыхтоўкі тэрактаў і злачынных дзеянняў, інфармацыйнаму забеспячэнню дзяржаўнай палітыкі. У цяперашні час АДКБ актыўна развівае розныя напрамкі сваёй дзейнасці. Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Д.А. Мядзведзеў лічыць, што сілы аператыўнага рэагавання па баявым патэнцыяле будуць не горш, чым аналагічныя структуры НАТА.

На думку прадстаўніка Упраўлення міжнароднай бяспекі Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь У.І. Бобышава, Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы не разглядаецца ў Рэспубліцы Беларусь у якасці ваеннага блока. АДКБ з'яўляецца міжнароднай рэгіянальнай арганізацыяй, якая займаецца шырокім спектрам праблем у адзначанай галіне. На парадку дня АДКБ (акрамя ваенных пагроз) знаходзяцца пытанні процідзеяння міжнароднаму тэрарызму, наркабізнесу, нелегальнай міграцыі, транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці, калектыўнага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, гуманітарных катастроф, шырокага спектра пагроз у інфармацыйнай сферы і барацьбы з кіберзлачыннасцю. Гэта не дэкларатыўная задача, якая запісана ў статутных дакументах арганізацыі, а рэальныя канкрэтныя алгарытмы калектыўнага рэагавання на патэнцыяльныя выклікі і пагрозы.

Рэспубліка Беларусь разам з іншымі членамі выступае за інтэнсіўнае развіццё супрацоўніцтва АДКБ з універсальнымі і рэгіянальнымі структурамі ў галіне бяспекі: з ААН, АБСЕ, НАТА. Пры гэтым падкрэсліваецца, што АДКБ не з'яўляецца канкурэнтам і, тым больш, не выступае ў якасці антыподу НАТА, што часам выказваецца асобнымі экспертамі. Значны спектр задач дзвюх арганізацый супадае, што дазваляе разлічваць у перспектыве на іх эфектыўнае ўзаемадзеянне. Пры гэтым Беларусь імкнецца не толькі выкарыстоўваць патэнцыял АДКБ для абароны сваіх нацыянальных інтарэсаў, але і сама дамагаецца выступаць у якасці донара міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі.

Паводле слоў кандыдата палітычных навук, дацэнта кафедры міжнародных адносін і знешняй палітыкі Расіі МДІМА Арцёма Мальгіна, «Беларусь можа ўнесці своеасаблівую дынаміку ў развіццё АДКБ на еўрапейскім флангу, таму што цяпер бачыцца вельмі выразны геаграфічны перакос у бок Цэнтральнай Азіі, часткова Закаўказзя, а еўрапейскі фланг проста прасядае ў гэтай арганізацыі. Можна спадзявацца, што Беларусь, якая цяпер выбудоўвае нанова адносіны з Еўрапейскім саюзам, можа ўнесці ў парадак дня сваіх новых адносін з ЕС і праблематыку АДКБ. Пры гэтым рабіць гэта яна будзе якім-небудзь іншым чынам, чым гэта робіць Масква» [5, с. 52].

Такім чынам, існаванне і дзейнасць такой арганізацыі як АДКБ абумоўлена неабходнасцю забеспячэння ваеннай падтрымкі дзяржаў-членаў адзін аднаму. Гэта выклікана тым, што ў наш час як у рэгіёне, так і ў свеце існуюць так званыя «гарачыя кропкі» і рэальная пагроза таго, што краіны, якія ўваходзяць у Арганізацыю, могуць падвергнуцца нападу. На сённяшні дзень можна адназначна сказаць, што АДКБ з'яўляецца гарантам бяспекі ў рэгіёне. Акрамя таго, краіны-ўдзельніцы АДКБ аб'ядноўваюцца ў барацьбе з наркатрафікам, пагрозай у сферы інфармацыйных тэхналогій і дапамагаюць адна адной ў барацьбе са злачыннасцю.

У перспектыве Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы павінна стаць арганізацыяй, якая адказвае ўсім патрабаванням, што прад'яўляюцца да структур такога ўзроўню як дзяржавамі-членамі, так і сусветнай супольнасцю ў цэлым.

Літаратура

1. *Довгань, Е.Ф.* Организация Договора о коллективной безопасности / Е.Ф. Довгань, А.А. Розанов. – Минск: Ковчег, 2010. – 137 с.
2. О миротворческой деятельности (Душанбе, 6 окт. 2007): Соглашение Организации Договора о коллективной безопасности: ратифицировано Законом Республики Беларусь от 23.06.2008 N 350-З // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011.
3. *Николаенко, В.Д.* Организация Договора о коллективной безопасности (истоки, становление, перспективы) / В.Д. Николаенко. – Москва: Научная книга, 2004. – 224 с.
4. *Кузьмин, В.* Сумма сил. Вчера АДКБ создала коллективные силы оперативного реагирования / В. Кузьмин, М. Фалалеев, Ю. Гаврилов // Российская газета. – 2009. – 5 февр. – С. 11.
5. Организация Договора о коллективной безопасности: сб. науч. ст. Федерация мира и согласия – междунар. обществ. орг.; редкол.: В.И. Камышанов (отв. ред.) [и др.]. – Москва: Мир и согласие, 2010. – 91 с.
6. *Казанцев, А.* Сотрудничество АДКБ с Афганистаном: возможные направления и перспективы / А. Казанцев // Афганистан.Ру [Электронный ресурс]. – 2007. – 15 марта. – Режим доступа: http://www.afghanistan.ru/doc/8356.html. – Дата доступа: 10.01.2012.

Summary

*The article deals with the policy of the CSTO (Collective Security Treaty Organisation) at the present stage, problems and prospects of its existence are considered. The role and significance of the Republic of Belarus in this union is indicated.*

Паступіў у рэдакцыю 11.01.2012 г.